Мінсувязі выпускае ў абарачэнне паштовую марку «Герб Добруша» з серыі «Гербы гарадоў Беларусі»

23 жніўня 2022 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне паштовую марку «Герб Добруша» з серыі «Гербы гарадоў Беларусі».

Дызайн Святланы Цырулік.

Марка друкавалася ў ДП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».

Герб горада Добруша Гомельскай вобласці ўяўляе сабой французскі шчыт, у зялёным полі якога намаляваныя тры бухты каната сярэбранага колеру з чорнымі швамі.

Герб зарэгістраваны ў Гербавым матрыкуле Рэспублікі Беларусь 6 красавіка 2001 г. пад № 54.

У дзень выпуску паштовай маркі ў абарачэнне ў аддзяленні паштовай сувязі № 4 Добруша Гомельскай вобласці будзе праводзіцца спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень».

Source URL: *https://www.mpt.gov.by/node/8015*